Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
____________________С.Л.Шпарло
_18_ _05_____________2023
Рэгістрацыйны № ВД-580/эвуч.

# КЛАС ФАЛЬКЛОРНА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАГА МАЙСТЭРСТВА

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць(фальклор),
спецыяльнасці 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяьнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбнага плана БДУКМ па напрамку спецыяльнасці спецыялізацыях.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Т.А.Пладунова*, дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В.М.Прыбылова*, дацэнт кафедры гісторыі музыкі і музычнай беларусістыкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», кандыдат мастацтвазнаўства;

*І.М. Грамовіч*, дэкан факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай народна-песеннай творчасці і фальклору* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (протокол №6 ад 27.12.2022);

*прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (протокол №.5 ад 15.03.2023).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» складаецца з раздзелаў – «Практыка фальклорнага выканальніцтва», «Выкананне спеўнага фальклору», «Выкананне музычна-інструментальнага фальклору», «Выкананне харэаграфічнага фальклору», «Выкананне тэатральна-гульнёвага фальклору».

Тэматыка заняткаў накіравана на ўдакладненне ў свядомасці будучых спецыялістаў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны месца практычнай фалькларыстыкі ў навуковым дыскурсе пра чалавека і чалавецтва.

Вучэбная дысцыпліна «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» цесна звязаны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі такімі як, «Беларуская этнамузыкалогія», «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» і інш.

*Мэты вучэбнай дысцыпліны:*

1) азнаямленне са спецыфікай прадмета праз характарыстыку музычнай фалькларыстыкі як навукі, вызначэнне эвалюцыі сферы яе інтарэсаў, паняццяў і катэгорый, а таксама найбольш значных тэарэтычных і метадалагічных праблем;

2) азнаямленне студэнтаў з асноўнымі этапамі навуковага аналізу, трансляцыі і рэвіталізацыі фальклорных адзінак;

3) раскрыццё асаблівасцей сцэнічнай адаптацыі музычнага фальклору.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды па гісторыі фарміравання практычнай музычнай фалькларыстыкі як асобнай навуковай галіны;

– раскрыць патэнцыял музычных фальклорных помнікаў для этнаэкалогіі беларусаў і для рэвіталізацыі іх нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

– сфарміраваць прафесійную кампетэнцыю даследчыкаў і пераемнікаў (забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці музычнай фальклорнай спадчыны для практычнай дзейнасці па яе захаванні) у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» студэнт павінен *ведаць*:

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгледжаныя ў межах дадзенай дысцыпліны;

– асноўныя падыходы да класіфікацыі музычных фальклорных адзінак па відах і жанрах;

– агульную характарыстыку, структуру, змест і гістарычную панараму фарміравання і бытавання музычнага мастацтва вуснай традыцыі Беларусі;

*умець:*

– выконваць песні, інструментальныя найгрышы на мінімум адным музычным інструменце, рытмізаваныя рухі (характэрныя для традыцыйнага сенсітыпу беларусаў), перанятыя ад носьбітаў фальклору ці з відэа- і аўдыёкрыніц;

– праводзіць этнафанічны, харэаграфичны і гульнёвы трэнінг у фальклорным калектыве;

– аналізаваць помнікі музычнага фальклору з пункту гледжання іх прыналежнасці да той ці іншай храналічнай ці відавай сістэмы;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны.

*валодаць:*

– сучасным тэрміналагічным слоўнікам навуковай і народнай тэрміналогіі па арганізацыі пераймання мастацтва вуснай традыцыі;

–метадамі распрацоўкі абрадавай карты свята;

– прыёмамі дакументавання фальклорных адзінак.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» усяго прадугледжана – 534 гадзіны, з якіх 322 гадзіны аўдыторныя (232 – практычныя, 90 – індывідуальныя) заняткі.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Роля вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыялістаў па фальклоры. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны.

Засваенне метадаў і выпрацоўка навыкаў вучэбнай (рэпетыцыйнай) работы з аматарскім фальклорным калектывам, планавання і правядзення заняткаў, адбору рэпертуару ў фальклорным гурце.

Выканальніцкая практыка ў рэчышчы мастацкай рэканструкцыі на дакументальнай аснове. Сцэнічная адаптацыя фальклору.

## Раздзел I. Практыка фальклорнага выканальніцтва

### Тэма 1. Стылі выканання фальклору

Фальклор як мастацтва вуснай традыцыі. Вусная перадача фальклорных адзінак як абявазковая ўмова існавання фальклору. Механістычнае капіраванне, стылізацыя, рэканструкцыя як прыступкі да пошуку адэкватных форм працы з фальклорам. Аўтэнтычны фальклор як ідэал і крыніца розных форм фалькларызму.

Выканальніцкая практыка. Выкананне беларускіх народных гульняў («Явар», «Цяцерка», “Шуляк”, інш) як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і моладзі.

### Тэма 2. Склад фальклорнага гурта

Узроставыя і гендэрныя характарыстыкі фальклорных гуртоў. Узроставыя і гендэрныя характарыстыкі ўдзельнікаў фальклорнага гурта як прадумова фарміравання рэпертуару і агульнай накіраванасці калектыва. Салісты і радавыя ўдзельнікі фальклорнага гурта. Роля салістаў і спантанных лідэраў у фарміраванні рэпертуару і агульнай накіраванасці калектыва.

Выканальніцкая практыка. Выкананне беларускіх народных гульняў «Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Яшчар» як сродак фарміравання спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору падлеткаў, камунікатыўных гендэрных стэрэатыпаў паводзін моладзі дашлюбнага ўзросту.

### Тэма 3. Беларускі фальклор у ХХ стагоддзі

Выканальніцкія накірункі у фальклоры ХХ стагоддзя. Аўтэнтычны фальклор і мастацкая самадзейнасць у форме трохсастаўнага народнага хору. Аўтэнтычны фальклор як прыклад трансляцыі мастацтва вуснай традыцыі і захавання ўзораў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Мастацкая самадзейнасць як вопыт спалучэння мастацтва вуснай і пісьмовай традыцыі.

Маладзёжны фальклорны рух як масавая з’ява культурнай сітуацыі другой паловы ХХ стагоддзя ва урбаністычных асяродках еўразійскага рэгіёну.

Выканальніцкая практыка: абрадавыя і пазаабрадавыя спевы.

### Тэма 4. Беларускі фальклор у XXI стагоддзі

Выканальніцкія накірункі ў фальклоры XXI стагоддзя. Аўтэнтычны фальклор і мастацкая самадзейнасць. Фарміраванне пад уздзеяннем фальклорнага руху XX стагоддзя постфальклорных выканаўцаў, эксперыментальных фальклорна-сцэнічных і фальклорна-эстрадных калектываў і выканаўцаў.

Фальклор і постфальклор як формы мастацтва вуснай традыцыі.

Выканальніцкая практыка: абрадавыя і пазаабрадавыя спевы, прыпеўкі. Сцэнічная адаптацыя, інтэрактыўныя вечарыны, тэматычныя пастаноўкі.

## Раздзел II. Выкананне спеўнага фальклору

### Тэма 5. Традыцыйны гукаідэал і яго сэнстворная роля ў фарміраванні пеўчага гуку

Традыцыйны гукаідэал як інтанацыйна-тэмбравая мадэль музычнай культуры этнасу (этнафоніі). Этнафанічныя складальнікі: тэмбр, гукавышыннасць, дынаміка, спосаб і манера гукавымання, своеасаблівасць інтанацыі, тып голасавядзення, тэмбрава-фактурныя спалучэнні галасоў у суполцы (тыпы харавой фактуры). Функцыянальны змест і традыцыйны кантэкст бытавання этнафанічных вакальных жанраў.

Выканальніцкая практыка: абрадавыя і пазаабрадавыя спевы.

### Тэма 6. Развіццё вакальных здольнасцей ў рэчышчы беларускай этнафанічнай традыцыі

Фанацыйны апарат як самарэгулятыўная біяакустычная сістэма вытворчасці музычных вобразаў. Тэарэтычныя веды аб будове фанацыйнага апарата і механіцы яго функцыянавання ў рэжыме этнафанацыі.

Выпрацоўка апоры пеўчага гуку. Праца з голасам у асноўным рэжыме фанацыі беларускай этнафанічнай традыцыі - пры шчыльным змыканні звязак (набліжаным да маўлення, т.зв. «грудным»).

Вакальны трэнінг у фальклорным гурце. *Першы этап:* Засваенне этнафанічных узораў з вузкім гукавым дыяпазонам, з паступовым меладычным рухам і нескладанымі інтэрвальнымі скачкамі (секундава-тэрцовыя, тэрцова-квінтовыя пераходы), з прымяненнем рэчытатыўнага і сігнальнага тыпаў голасавядзення. Нейтральная дынаміка фанацыі (*mf)*, паступовасць пашырэння тэмбральна-дынамічнага дыяпазону *(p - f)*. Выпрацоўка дыкцыі і артыкуляцыі галосных і зычных з адкрытай падачай гуку ў сярэднеязычнай пеўчай пазіцыі (набліжанай да маўлення).

Развіццё пеўчага дыхання. Замацаванне навыкаў шчыльнага змыкання звязак. Адпрацоўка дакладнай інтанацыі, дыкцыі, вакальных навыкаў пры «грудным» гучанні ў прымарным дыяпазоне фанацыі. Праца над рэчытатыўна-сігнальным тыпам голасавядзення.

*Другі этап*: Замацаванне апоры пеўчага гуку. Пашырэнне дыяпазону пеўчага голасу ў рэжыме шчыльнага змыкання звязак да межаў актавы для жаночых гадасоў, дэцымы для мужчынскіх галасоў. Аўтаматызм пераключэння ў рознай паслядоўнасці ніжняга-сярэдняга-высокага рэгістраў на ўсім «грудным» дыяпазоне пеўчага голасу.

Выпрацоўка каардынацыі работы фанацыйнага апарата пры міжрэгістравых пераходах пеўчага голасу.

*Трэці этап*. Фактар пеўчай рэдукцыі пры этнафанацыі: пазіцыйнае прыпадабненне галосных гукаў адзін да аднога, дыялектныя асаблівасці пеўчага вымаўлення фанем. Удасканаленне тэхнікі пеўчага голасу: засваенне рэчытатыўна-вакальнага і вакальна-танцавальнага тыпаў голасавядзення (карагоды, танцавальна-прыпевачныя, лірызаваныя творы).

Этнафанічная транскрыпцыя песенных узораў з улікам пеўчай рэдукцы: вызначэнне артыкуляцыйнай мадэлі выканання ўсяго твора, асобных фраз; ступені прыпадабнення галосных песеннага выказвання на ўсім дыяпазоне і пры міжрэгістравых пераходах.. Практыкаванні па авалоданні рэчытатыўна-вакальным і вакальна-танцавальным тыпамі голасавядзення.

## Тэма 7. Выкананне спеўнага фальклору ў розных камунікацыйных сітуацыях

Фальклор, мастацтва вуснай традыцыі як функцыянальны дадатак да стандартных жыццёвых сітуацый каляндарных цыклаў і цыкла жыцця чалавека. Камунікатыўны бок фальклору як актуальны сродак камунікацыі нават пры знікненні ці мадэрнізацыі традыцыйнага лада жыцця.

Выканальніцкая практыка: абрадавыя і пазаабрадавыя спевы, прыпеўкі да танцаў, гульнёвыя карагоды.

## Тэма 8. Формульныя тыповыя напевы абрадавай этнафоніі

Формульныя напевы каляндарных і сямейна-абрадавых песень як знакі-сімвалы традыцыйнай камунікацыі і помнікі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Спеўны стыль і манера выканання як характарыстыкі фальклорнага выканальніцтва і спосабы самавыяўлення адмысловых і звычайных спевакоў.

Выканальніцкая практыка: каляндарныя і сямейна-абрадавыя песні.

## Тэма 9. Спевы з шумавым акампанементам

Сінкрэтызм фальклорнага выканальніцтва, у якім арганічна спалучаецца вакальны, рухальны, гукаімітацыйны спосабы самавыяўлення. Сродкі шумавога акампанемента ў беларускай этнафанічнай традыцыі. Шумавое суправаджэнне ў абрадавых і гульнёвых сітуацыях.

Выканальніцкая практыка: каляндарныя песні, танцы з прыпеўкамі, гульні і гульнёвыя карагоды.

### Тэма 10. Сцэнічная адаптацыя спеўнага фальклору

Умовы сацыялізацыі захавальніка фальклору ў сучасным прафіяналізаваным грамадстве. Нарматыўныя (арганізацыйныя, дыдактычныя, канцэртныя) патрабаванні да фальклорнага калектыва з боку адміністрацыі ўстановы культуры, адукацыі, пазашкольнага навучання і выхавання.

Фальклорныя спевы – спевы ў натуральнай акустыцы. Выбар сцэнічнай пляцоўкі, патрабаванні (акустычныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да выканаўцаў спеўнага фальклору ва ўмовах сцэнічны.

Выканальніцкая практыка: канцэртныя праграмы паводле абрадавага і пазаабрадавага песеннага фальклору, інтэрактыўныя вечарыны, тэматычныя пастаноўкі.

### Тэма 11. Пабудова праграмы пры сцэнічным выкананні спеўнага фальклору

Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі спеўнага фальклору. Сцэнічныя выступы як мэта і як сродак жыццядзейнасці фальклорнага спеўнага калектыва. Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да сцэнічнага выступу і спецыфіка спеўнага фальклору.

Прынцыпы пабудовы канцэртнай спеўнай праграмы – акустычны разлік, драматургія, кантрастнасць, рознажанравасць, выкарыстанне тэхнічных сродкаў (экранных, гукавых. сцэнаграфічных).

Патрабаванні да гукаўзмацняльнай апаратуры пры адсутнасці натуральных акустычных умоў. Пабудова ўласнай акустычнай мадэлі сродкамі карэкцыі месцазнаходжання спевакоў на сцэне.

Выканальніцкая сцэнічная практыка: канцэртныя праграмы, інтэрактыўныя вечарыны, тэматычныя пастаноўкі, удзел у зборных канцэртах, фестывалях.

## Раздзел III. Выкананне музычна-інструментальнага фальклору

### Тэма 12. Народная інструментальная музыка

Звесткі пра выраб інструментаў, сольнае і ансамблевае выканальніцтва народнай музыкі на Беларусі.

“Голас” прылады, якая гучыць, паводле народных уяўленняў. Успрыманне беларусамі музычнага інструмента як жывой істоты, якая здольна гаварыць, расказваць, спяваць, галасіць і нават крычаць.

Вывучэнне народных музычных інструментаў у межах этнаінструментазнаўства, ці этнаарганалогіі. Падзел па крыніцы гуку (адпаведна сістэматыцыі Закса – Харнбостэля) беларускіх інструментаў на чатыры групы: самагучальныя, мембранныя, духавыя, струнныя інструменты. Даследаванні буйнога айчыннага этнамузыколага Беларусі, доктара мастацтвазнаўства І.Д. Назінай.

Выканальніцкая практыка: асваенне народных інструментаў, выкананне традыцыйных найгрышаў да побытавых танцаў і гульняў

(“Кракавяк”, “Лявоніха”, “Месяц”, “Базар”, інш.; “Явар”, “Юрачка”, “Падушачка”, “Цяцерка”, інш.).

**Тэма 13. Ансамль народнай музыкі.**
**Сольнае і ансамблевае выканальніцтва.**

Гендэрныя і сацыяльныя характарыстыкі традыцыйных музыкаў-інструменалістаў на Беларусі.

Паняцце “траістая музыка”. Функцыі музычных інструментаў ў капэлі тыпу “траістая музыка”. Традыцыйны склад беларускай інструментальнай капэлі і сучаснае выканальніцтва.

Выканальніцкая практыка: сольнае і ансамблевае выкананне традыцыйных найгрышаў да побытавых танцаў і гульняў.

**Тэма 14. Сцэнічная адаптацыя музычна-інструментальнага фальклору**

Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі музычнага фальклору. Інфармацыйная аўдыёпрастора і месца ў ёй народнай інструментальнай музыкі. Патрабаванні (акустычныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да сцэнічных выканаўцаў музычна-інструментальнага фальклору. Прафесіяналізацыя інструментальных калектываў маладзёжнага фальклорнага руху напрыканцы XX стагоддзя: страты і дасягненні.

Прынцыпы пабудовы канцэртнай музычна-інструментальнага праграмы – акустычны разлік, драматургія, кантраснасць, рознажанравасць, выкарыстанне тэхнічных сродкаў (экранных, гукавых. сцэнаграфічных).

Выканальніцкая сцэнічная практыка: канцэртныя музычныя праграмы, інтэрактыўныя вечарыны з танцамі і гульнямі, удзел у зборных канцэртах, фестывалях.

**Тэма 15. Акустыка сцэны**
**і месцазнаходжанне музыкаў у час выступленняў**

Фальклорная інструментальная музыка – музыка ў натуральнай акустыцы. Выбар сцэнічнай пляцоўкі і адпаведнай для яе ўмоў музычнай праграмы. Патрабаванні да гукаўзмацняльнай апаратуры пры адсутнасці натуральных акустычных умоў. Пабудова ўласнай акустычнай мадэлі сродкамі карэкцыі месцазнаходжання музыкаў-інструменталістаў на сцэне.

Выканальніцкая сцэнічная практыка: канцэртныя музычныя праграмы, інтэрактыўныя вечарыны з танцамі і гульнямі.

**Тэма 16. Патрабаванні да музычна-інструментальнага гурта на зборных канцэртах і фестывалях**

Патрабаванні (часовыя, тэмпарытмічныя, рэжысёрскія) да зборнага канцэрта і спецыфіка музычна-інструментальнага фальклору. Прынцыпы пабудовы канцэртнай праграмы – акустычны разлік, драматургія, кантраснасць, рознажанравасць. Падбор танцавальных і песенных найгрышаў як асновы сцэнічнага рэпертуару.

Адрозненні фальклорных фестываляў ад фестываляў мастацкай самадзейнасці і музычных фестываляў (статут, мэты, этыка ўдзельнікаў). Абавязковае суаднясенне сезону правядзення фестывалю з музычна-інструментальным рэпертуарам фестывальнага выступу. Уласны рэгіянальны рэпертуар і характэрны музычны інструментарый як умова ўдзелу ў фальклорным фестывалі.

Выканальніцкая сцэнічная практыка: канцэртныя музычныя праграмы, удзел у зборных канцэртах, фестывалях.

## Раздзел IV. Выкананне харэаграфічнага фальклору

### Тэма 17. Танцавальны фальклор беларусаў як мастацкая сістэма

Формы бытавання харэаграфічнай традыцыі ў сучаснай беларускай вёсцы (актыўная і пасіўная). Узаемасувязь падсістэм: карагод, танец, скокі.

Карагодны комплекс танцавальнага фальклору. Функцыі карагодаў (абрадавыя, прымеркаваныя да абрадаў ці пэўнага часу, пазаабрадавыя). Жанравая спецыфіка карагодаў (песенныя, гульнявыя, танцавальныя). Характарыстыка стылю карагодаў.

Група познатрадыцыйных танцаў: традыцыйныя і асіміляваныя танцы. Групы пазаабрадавых танцаў: арнаментальныя, імправізаваныя, танцы-гульні. Танцы гуртавыя, парныя, сольныя.

Сродкі мастацкай выразнасці танца – лексіка, кампазіцыя, структура, як складнікі стылю. Формы музычнага суправаджэння танца.

Выканальніцкая практыка: засваенне парных побытавых танцаў як сродка фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі.

### Тэма 18. Лексіка побытавага танца і пластычны трэнінг у фальклорным гурце

Традыцыйныя і побытавыя танцы рэгіёнаў Беларусі. Побытавы танец як даступны і дэмакратычны від фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу. Гендэрныя і ўзроставыя характарыстыкі выканаўцаў побытавых танцаў на Беларусі.

Асноўныя віды беларускіх побытавых танцаў: сольныя, парныя танцы, парна-гуртавыя, танцы з няцотнай колькасцю выканаўцаў.

Пазіцыі і паставы ног, рук, корпуса, галавы ў народным танцы, паклон. Асноўныя групы харэаграфічнай лексікі: 1) Асноўныя пазіцыі ног: прамыя, свабодныя, закрытыя (завярнутыя). Асноўныя паставы ног: нага на падлозе, узнята – наперад, убок, назад; асноўныя паставы ступнёў — на падлозе, у паветры; асноўныя паставы каленяў — выпрастаныя, паўсагнутыя, сагнутыя. 2) Асноўныя пазіцыі рук: падрыхтоўчая, першая, другая, трэцяя. Паставы рук у статыцы і дынаміцы. Асноўныя паставы рук: рукі выпрастаныя, паўсагнутыя, сагнутыя; рукі ляжаць — далонямі на таліі, на таліі кулачкамі, вонкавым бокам кісці; на таліі за спінай, скрыжаваны перад сабой. 3) Асноўныя паставы локцяў: локці накіраваны уніз, узняты наперад, узняты

убок. 4) Пазіцыяі і паставы кісцей: кісці выпрастаныя, паўсагнутыя, сагнутыя ў кулак; павернуты — далонню да корпуса, далонню наперад, далонню назад. Асноўныя паставы кісцей у самкнутай форме. 5) Злучэнні рук ў парным танцы: рукі ў адкрытай паўзамкнёнай і замкнёнай паставах; у паўзакрытай паставе, у закрытай паставе. 6) Злучэнне рук у гуртавых (парна-гуртавых. танцах тройкамі) танцах. 7) Паклоны – жэсты вітання і развітання.

Лексіка сольных танцаў (тыпу “Мікіта”, “Каза”, ”Барыня”, “Жабка”).

Асаблівасці пластычнага трэнінгу у фальклорным калектыве як асяродку трансляцыі мастацтва вуснай традыцыі. Затраты часу пры спантанна-адвольным і пры дыдактычна вывераным фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу.

Выканальніцкая практыка: засваенне лексікі народнага танца, пластычны трэнінг на яе аснове.

## Тэма 19. Кампазіцыя беларускага народнага танца

Структурныя элементы беларускага народнага танца. Пабудова, размяшчэнне, паслядоўнасць асноўных складнікаў ва ўзаемасувязі статычных і дынамічных яго кампанентаў. Асноўныя элементы як складнікі кампазіцыі танца: шарэнга (асобная – гарызантальная, вертыкальная, гарызантальная; шарэнгі “ві-за-ві”), кола (кола асобнае, кола ў коле, колы побач), паўкола, “змейка” (“вужака”), калона; фігуры – “крыж”, “зорачка”, “кошык”, “мост”, “ручаёк”, “качан”, “пляцёнка”, гарох”, “шэн”.

Кампазіцыя арнаментальных танцаў (парныя, гуртавыя формы).

Кампазіцыя парных танцаў: “Лявоніха”, полька “Бабачка”, “Кракавяк”, “Падэспань”, “Какетка”, “Каханачка”, “Матлёт”, “Месяц”, “Нарэчанька”, “Войра”, “Ночка”, інш.

Кампазіцыя парна-гуртавых танцаў: “Лявоніха”, “Мяцеліца”, “Грачанікі”, “Акуліна”, “Шэн”, кадрылі (на 2, 4, 6, 8 пар), танцы тыпу кадрылі (традыцыйныя, полька, вальс). Танцы з няцотнай колькасцю выканаўцаў (упяцёх, тройкамі).

Выканальніцкая практыка: засваенне і выкананне сольных, парных і гуртавых танцаў.

## Тэма 20. Абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах выканання карагоды

Традыцыйныя карагоды як крыніца розных відаў мастацтва. Сінкрэтызм карагодаў. Гендэрныя і ўзроставыя характарыстыкі выканаўцаў карагодаў на Беларусі.

Функцыянальная класіфікацыя карагодаў: абрадавыя каляндарныя, сямейна-абрадавыя, прымеркаваныя да абрадаў, пэўнага часу і абставін; пазаабрадавыя. Формы рытуальных паводзін у абрадавых карагодах, іх пластычна-кампазіцыйнае ўвасабленне.

Кампазіцыя карагодаў (песенных, гульнявых, танцавальных).

Выканальніцкая практыка: засваенне і выкананне карагодаў тыпу “кола” (“Перапёлка”, “Чырачка”), “сценка на сценку” (“Баяры”, “Царэвіч-каралевіч”), “крывы танок” (“Лука”), “ручаёк” (“Ой, венцэ, венцэ”).

**Тэма 21. Выкананне харэаграфічнага фальклору ў розных камунікацыйных сітуацыях**

Харэаграфічны фальклор у кантэксце мастацтва вуснай традыцыі як функцыянальны дадатак да стандартных жыццёвых сітуацый каляндарных цыклаў і цыклаў жыцця чалавека.

Камунікатыўны бок харэаграфічнага фальклору як актуальны сродак камунікацыі нават пры знікненні ці мадэрнізацыі традыцыйнага лада жыцця.

Рэжым харэаграфічных рухаў у закрытых памяшканнях і ў натуральным ландшафце. Характар накіраванасці на «затаптванне», прытоп «па зямлі», скокі, спружынены крок у традыцыйнай харэаграфіі беларусаў. Тэмперамент і артыстызм выканання. Залежнасць амплітуды харэаграфічных рухаў ад месца і ўмоў выканання танца.

Выканальніцкая практыка: выкананне карагодаў і танцаў у нязмушаных побытавых умовах вольнага часу, інтэрактыўныя танцавальна-гульнёвыя вечарыны.

**Тэма 22. Выкананне харэаграфічнага фальклору на сцэне**

Сцэнічная адаптацыя як сродак папулярызацыі харэаграфічнага фальклору. Прафесіяналізацыя харэаграфічных калектываў маладзёжнага фальклорнага руху на прыканцы ХХ стагоддзя: страты і дасягненні.

Інфармацыйная відэапрастора і месца ў ёй народнай харэаграфіі. Патрабаванні (візуальныя, рэпертуарныя, тэхнічныя) да сцэнічнага ўвасаблення харэаграфічнага фальклору.

Адбор рэпертуару для сцэнічнай адаптацыі харэаграфічнага фальклору. Танцавальна-прыпевачная этнафонія. Прынцыпы пабудовы канцэртнай харэаграфічнай праграмы – драматургія, кантраснасць, рознажанравасць. Падбор побытавых танцаў і танцавальных гульняў як асновы сцэнічнага рэпертуару.

Выканальніцкая практыка: выкананне карагодаў і танцаў з прыпеўкамі як сродак фарміравання традыцыйнага рухальнага сенсітыпу пры далучэнні да фальклору дзяцей і моладзі ва ўмовах сцэнічнай практыкі.

**Раздзел V. Выкананне тэатральна-гульнёвага фальклору і народный прозы**

**Тэма 23. Засваенне празаічных жанраў фальклору**

Мастацкае асэнсаванне і адлюстраванне рэчаіснасці ў празаічных жанрах фальклору.

Казкавая проза: казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя (уласна бытавыя, сацыяльна-бытавыя і навелістычныя). Алегарычнасць як аснова вобразнай сістэмы казак пра жывёл. Трансфармацыя архаічнага канфлікту чалавека і сіл прыроды ў сацыяльны або бытавы канфлікт у чарадзейнай казцы.

Сацыяльныя адносіны, сялянскі побыт і народныя маральна-этычныя нормы ў бытавых казках. Разнавіднасці казачнага эпасу: легендарныя казкі, казкі-небыліцы. Народнае пераасэнсаванне рэлігійных дагматаў у легендарных казках. Сродкі стварэння мастацкіх вобразаў у казках-небыліцах.

Няказкавая проза: легенды, паданні, сказы, прымхліцы. Інфарматыўная функцыя як вызначальны фактар няказкавай прозы. Легенды паводле гісторыка-тэматычнага прынцыпу: этыялагічныя, духоўна-этычныя, гісторыка-культурныя, дэманалагічныя. Светапоглядны дуалізм легенд. Прынцыпы гуманізму і народнай этыкі ў легендах. Паданні паводле тэматычнага прынцыпу: гістарычныя, тапанімічныя, паданні пра скарбы, міфалагічныя паданні. Анекдоты, жарты, гумарэскі.

Маўленчыя жанры фальклору: прыказкі, прымаўкі, прыметы, павер'і, загадкі, выслоўі. Прыказкі як увасабленне народнай мудрасці, жыццёвага вопыту і маральна-этычных норм. Афарыстычнасць прыказак і разнастайнасць тэматыкі, іх класіфікацыя. Анімістычная аснова загадак, сувязь іх з іншасказальнай мовай. Багацце жанравых формаў загадак (сказы, пытанні, жарты, задачы). Прыказкі і загадкі як сюжэтны элемент у песнях і казках.

Замовы. Анімістычная аснова і утылітарна-магічная прырода замоў. Носьбіты замоў і асаблівасці бытавання. Знахарства і чарадзейства. Хрысціянская сімволіка ў замовах. Замовы паводле тэматычнага прынцыпу: гаспадарчыя, ахоўныя, лекавыя, замовы, звязаныя з сацыяльным і сямейным бытам. Кампазіцыя замоў. Паэтыка замоў. Існаванне замоў у сучасным жыцці.

Выканальніцкая практыка: засваенне і выкананне твораў народнай прозы, выпрацоўка артыстызму выказвання дзеля прэзентацыі ва ўмовах побытавай і сцэнічнай практыкі.

## Тэма 24. Дзіцячы фальклор і гульня

Паняцце «дзіцячы фальклор». Фальклор для дзяцей і ўласна дзіцячая творчасць. Жанравы склад і прынцыпы класіфікацыі дзіцячага фальклору. Дзіцячы фальклор у кантэксце беларускай духоўнай культуры і этнапедагогікі. Вершаваныя і празаічныя, гульнёвыя і негульнёвыя жанры дзіцячага фальклору. Функцыянальнае прызначэнне і мастацкія асаблівасці калыханак і забаўлянак. Гульня як сродак сацыялізацыі асобы. Гульні-дзеянні (рэгламентаваныя і імправізаваныя) і гульні мастацка-драматычнага ладу. Гульнёвыя карагоды. Слоўныя гульні. Функцыя лічылак і слоўных прыгавораў. Песні-заклічкі і кола іх адрасатаў. Дражнілкі як частка народнай смехавай культуры.

Выканальніцкая практыка: засваенне і выкананне твораў вершаваных і празаічных, гульнёвых і негульнёвых жанраў дзіцячага фальклору, гульнёва-пазнавальная дзейнасць ў дзіцячай аўдыторыі. Гульнёвая дзейнасць як сродак спантаннага, нязмушанага далучэння да фальклору дзяцей і падлеткаў.

## Тэма 25. Абрадавыя, побытавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах гульні.

Генетычна-функцыянальная сувязь гульняў з магіяй і абрадамі. Структурныя элементы гульні.

Абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах гульні зімовага перыяду (“Каза”, “Яшчар”, “Бахар”, “Жаніцьба Цярэшкі”, “Халімон”, “Зязюля”, “Гусары”, “Падушачка”, “Заінька”, “Мак”, “Грушка”).

Абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах гульні веснавога і летняга сезонаў (“Проса”, “Мак”, “Явар”, “Старац”, “Удавец”, “Цар”, “Перапёлачка”, “Цяцерка”, “Баяры”).

Вясельныя і хрэсьбінныя гульні і ігрышчы беларусаў. Народныя забавы беларускага кірмашу.

Выканальніцкая практыка: засваенне і выкарыстанне гульняў у абрадавых цырымоніях, канцэртнай практыцы і інтэрактыўнай сацыяльнай дзейнасці.

## Тэма 26. Народны тэатр

Народны тэатр як від народнай творчасці. Умоўнасць мастацка-выяўленчых кампанентаў, непасрэднасць кантакту з гледачамі. Сінкрэтызм. Травестацыя.

“Зязюля”, “Гусары”, “Падушачка”, “Заінька”, “Мак”, “Грушка”).

Тэатральна-драматычныя прадстаўленні падчас кірмашоў і святаў. Лялечны тэатр “Батлейка”. Школьны тэатр. Інтэрмедыі.

Народная драма як найвышэйшая форма народнага тэатра. Карнавальныя матывы народнай драмы. Прымеркаванасць да каляднага цыкла народных гульняў і паказаў. Рэпертуар, галоўныя матывы і вобразы народнага тэатра.

Культурныя вытокі беларускай батлейкі і яе нацыянальная самабытнасць. Віды батлейкі (лялечная пантаміма з хорам, лялечная батлейка з агучваннем роляў, «жывая» батлейка, камбінаваны від). Носьбіты традыцыі. Тэатральны рэквізіт. Рэлігійная частка батлейкі. Драматургія асноўнага сюжэта. Містэрыяльная драма «Цар Ірад». Сюжэты і героі свецкай часткі батлейкавага прадстаўлення (народных интэрмедый). Узвышаная стылістыка рэлігійнай часткі і зніжаная свецкай.

